Весці БДПУ. Серыя 2. 2019. № 2. С. 21–25

УДК 930:[94:329.14](476)

# АНАЛІЗ ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ ГІСТОРЫІ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА КІРУНКУ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

**П. А. Трубчык,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*

Паступіў у рэдакцыю 29.10.18.

UDC 930:[94:329.14](476)

# ANALYSIS OF HISTORIOGRAPHICAL RESEARCH OF THE HISTORY OF POLITICAL PARTIES OF THE SOCIALIST DIRECTION IN THE TERRITORY OF BELARUS IN THE END OF XIX – BEGINNING OF THE XX CENTURIES

**P. Trubchyk,**
*PhD in History, Associate Professor of the Department of History of Belarus and Slavic Nations, Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank*

Received on 29.10.18.

Праводзіцца ўсебаковы аналіз гістарыяграфічных даследаванняў партый сацыялістычнага кірунку, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст., вызначаюцца заканамернасці і асаблівасці працэсу назапашвання гістарычных ведаў па праблеме.

Артыкул утрымлівае палажэнні, якія характарызуюць аўтарскі пункт гледжання на тыя ці іншыя ацэнкі, высновы і абагульненні, прадстаўленыя ў аналізуемай літаратуры. У працы вызначаны шэраг найменш даследаваных пытанняў афармлення і дзейнасці сацыялістычных партый на тэрыторыі Беларусі, якія патрабуюць далейшага дэталёвага вывучэння.

*Ключавыя словы:* Беларусь, гістарыяграфія, сацыялістычныя партыі, нацыянальныя партыі.

Comprehensive analysis of historiography researching of socialist parties that acted in Belarus in the end of the XIXth and the beginning of the XXth centuries is performed, the laws and peculiarities of the process of accumulating historical knowledge on the problem are determined.

The article contains provisions that characterize the author's point of view on those or other assessments, conclusions and generalizations presented in the analyzed literature. A number of the least studied issues of design and activities of socialist parties in Belarus, which require further detailed study, is determined in the work.

*Keywords:* Belarus, historiography, socialist parties, national parties.

*Уводзіны.* Гістарычная навука зрабіла значны ўклад у даследаванне гісторыі палітычных партый. У ходзе гістарычнага пазнання адкрываюцца новыя магчымасці ў тэарэтычнай і метадалагічнай інтэрпрэтацыі навуковых праблем. Адной з такіх з'яўляецца праблема станаўлення і дзейнасці партый сацыялістычнага кірунку на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. У Расійскай імперыі ў гэты перыяд былі прадстаўлены ўсе важнейшыя кірункі сацыялістычнай ідэалогіі. Пераход да сацыялізму з розных пазіцый дэкларараваўся ў праграмах Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (РСДРП) і Партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (ПСР), якія мелі свае аддзелы на тэрыторыі Беларусі. Акрамя таго, на беларускіх землях эсэраўска-народніцкая і сацыял-дэмакратычная палітычныя плыні набылі нацыянальную спецыфіку ў выглядзе беларускага, польскага, яўрэйскага і іншых нацыянальных рухаў.

Задачай артыкула з'яўляецца ўсебаковы аналіз гістарыяграфічных даследаванняў партый сацыялістычнага кірунку, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст., вызначэнне заканамернасцей і асаблівасцей працэсу назапашвання гістарычных ведаў па праблеме.

*Асноўная частка.* Гісторыю развіцця даследаванняў палітычных партый можна падзяліць на некалькі перыядаў, падчас якіх праводзілася выданне гістарыяграфічных прац. Першы перыяд ахоплівае пачатак XX ст. – 1917 г., другі – 1920–1980-я гг., трэці –

Рэпазіторый БДПУ

1990-я гг. – пачатак XXI ст. Гістарыяграфія партый сацыялістычнага кірунку, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст., уяўляе сабой сукупнасць прац, якую складаюць: абагульняльныя працы па праблемах гістарыяграфіі Беларусі: артыкулы, манаграфіі, навучальныя дапаможнікі, дысертацыі; уводныя раздзелы дысертацый і манаграфій па гісторыі палітычных партый і рухаў; непасрэдныя навуковыя артыкулы па праблеме. Рамкі публікацыі дазваляюць разгледзець толькі найбольш значныя, на наш погляд, даследаванні.

Першай спробай гістарыяграфічнага аналізу станаўлення і дзейнасці партый сацыялістычнага лагера можна лічыць бібліяграфічны нарыс, выдадзены пад рэдакцыяй меншавікоў Ю. В. Мартава, П. П. Маслава і А. М. Патрэсава – «Общественное движение в России в начале XX века» [1]. Аўтары чатырохтомнага выдання (прадугледжвалася пяць тамоў, але з-за пачатку Першай сусветнай вайны выйшла толькі чатыры), зыходзячы з палітычных мэт, імкнуліся ўзвысіць ролю сацыял-дэмакратыі і, адпаведна, выявіць «недахопы» народніцтва. Некаторыя працы (публіцыстыка Б. В. Савінкова, В. М. Чарнова) характарызаваліся як «пранародніцкія» і ідэалізуючыя гісторыю партыі эсэраў. Іншыя, напрыклад, артыкулы і манаграфіі П. Б. Аксельрода, Ю. В. Мартава, А. М. Патрэсава, ацэньваліся пазітыўна, паколькі ўтрымлівалі моцны крытычны патэнцыял, накіраваны супраць эсэраў, якія абвінавачваліся ў «вузкім дактрынстве», «палітычнай нявопытнасці» і стаўцы на «вельмі розныя сацыяльныя слаі насельніцтва» – пралетарыят, працоўнае сялянства і дэмакратычную інтэлігенцыю. Выказаныя меркаванні зводзіліся да таго, што партыя эсэраў узнікла выключна дзякуючы ўздыму народных хваляванняў у гады першай рускай рэвалюцыі, а пасля яе паражэння апынулася ў стане глыбокага крызісу і страціла палітычны аўтарытэт. Адсюль рабіліся высновы аб «сумнiўнасці» эсэраўскай ідэалогіі і неабходнасці ацэньваць гісторыю ПСР у кантэксце сацыял-дэмакратычнай крытыкі [1, т. IV, с. 155].

У цэлым жа, стварыць грунтоўныя гістарыяграфічныя працы ў дакастрычніцкі перыяд сацыял-дэмакраты не змаглі, зрэшты, і мэта такая не ставілася, паколькі асноўная праца вялася ў жанры палітычнай публіцыстыкі.

У 1922 г. быў апублікаваны бібліяграфічны агляд літаратуры аб ПСР, падрыхтаваны С. Інгулавым. Аднак аўтар абмежаваўся толькі пералікам публікацый, без крытычнага іх асэнсавання [2].

Неабходна адзначыць, што ў літаратуры 1930 – сярэдзіны 1950-х гг. цікавасць да гісторыі многіх партый (акрамя бальшавікоў) сацыялістычнага кірунку зніжаецца, што паўплывала на гістарыяграфічную распрацоўку тэмы. На гэтым этапе не з'явілася ніводнай гістарыяграфічнай працы.

Пасля XX з'езда КПСС перад савецкімі гісторыкамі з'явіліся новыя магчымасці, у тым ліку пры даследаванні гісторыі палітычных партый. Пэўны ўклад у гістарыяграфічнае абагульненне пазіцый і поглядаў расійскіх даследчыкаў па заяўленай праблематыцы зрабіў гісторык Л. М. Спірын [3]. Ён ахарактарызаваў развіццё даследаванняў гісторыі «дробнабуржуазных партый» у СССР у 1920–1960-я гг., вылучыў этапы іх вывучэння. На думку даследчыка, з сярэдзіны 1950-х гг. павялічваецца колькасць прац аб эсэрах і меншавіках, пашыраецца праблематыка даследаванняў, у навуковы зварот уводзіцца вялікая колькасць новых крыніц. Разам з тым, адзначаюцца і недахопы, характэрныя для савецкай гістарыяграфіі гэтага перыяду. Яны былі звязаны з няпоўным асвятленнем многіх пытанняў гісторыі неанародніцкіх і сацыял-дэмакратычных партый. У прыватнасці, слабая цікавасць даследчыкаў да вывучэння генезісу партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, меншавікоў, энэсаў, трудавікоў і ў цэлым да дакастрычніцкага перыяду гісторыі партый сацыялістычнага кірунку.

У дальнейшым колькасць гістарыяграфічных даследаванняў павялічваецца. Як правіла, гэта працы, прысвечаныя асобным палітычным партыям, якія разглядалі гістарычную літаратуру ў розных тэрытарыяльных і храналагічных межах [4], а таксама абагульняючыя даследаванні, дзе працы па гісторыі эсэраў і меншавікоў аналізаваліся разам з літаратурай аб іншых палітычных партыях [5]. Даследаванні характарызуюцца ўстойлівай схемай падачы гістарыяграфічнага матэрыялу: абгрунтаванне актуальнасці вывучэння тэмы «краху непралетарскіх (дробнабуржуазных) партый»; перыядызацыя гісторыі вывучэння ПСР і РСДРП з вылучэннем трох этапаў (1920-я – пачатак 1930-х; сярэдзіна 1930-х – сярэдзіна 1950-х; з другой паловы 1950-х – сучасны этап); характарыстыка літаратуры па этапах; перспектывы даследаванняў. Недахопы прац савецкіх аўтараў былі звязаны пераважна з недастатковым асвятленнем асобных пытанняў гісторыі меншавікоў, эсэраў і нацыянальных партый.

У гэтых працах правільна адзначаны асноўныя рысы развіцця савецкай гістарыя-

Рэпазіторый БДПУ

графіі. Гэта тычыцца самой неабходнасці падзелу гістарыяграфіі партый сацыялістычнага кірунку на этапы, ацэнкі ўкладу асобных даследчыкаў у развіццё тэмы. Разам з тым, неабходна адзначыць, што аўтары многіх гістарыяграфічных прац не заўважалі недахопы гістарычных даследаванняў адзначанага перыяду – абмежаванасць іх праблематыкі, нізкая навуковая значнасць, вузкая крыніцазнаўчая база. Не ўлічваліся спецыфіка гістарыяграфічнай дынамікі, роля культурных і міждысцыплінарных узаемасувязей.

З пачатку 1990-х гг. у айчыннай гістарыяграфіі сацыялістычных партый пачынаецца новы этап, які не атрымаў яшчэ належнага разгляду ў літаратуры. Разам з тым, у апошнія гады некалькі спроб абагульнення ацэнак сучаснага стану гістарыяграфіі палітычных партый канца XIX – пачатку XX ст. зроблена расійскімі аўтарамі [6]. Такія даследаванні ўтрымліваюць аналіз развіцця гістарычнай навукі ў розных тэматычных і храналагічных межах. Характарыстыка даследаванняў па гісторыі ПСР, РСДРП, нацыянальных партый сацыялістычнага кірунку, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі, разглядаецца ў кантэксце іншых тэм. Разам з тым, адзначаныя публікацыі дапамагаюць зразумець логіку развіцця айчыннай гістарычнай навукі ў апошнія дзесяцігоддзі, вызначыць яе вядучыя тэндэнцыі. У прыватнасці, аўтары публікацый адзначаюць, что да канца 1990-х гг. у асноўным пераадолена метадалогія, разглядаючая дзейнасць усіх партый праз прызму бальшавізму; з'яўляюцца абагульняючыя працы, якія характарызуюць персаналіі партыйных лідараў, прычым галоўным крытэрыем у ацэнцы асоб партыйных дзеячаў стаў іх рэальны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці краіны; дасягненні сусветнай навуковай думкі ўключаюцца ў айчынную гістарыяграфію.

У спецыяльных гістарыяграфічных даследаваннях расійскіх навукоўцаў безумоўны прыярытэт па колькасці і якасці прац належыць РСДРП. У працах С. В. Цюцюкіна [7], М. І. Смірновай [8], І. Х. Урылава [9], А. П. Ненарокава [10] разглядаецца гістарыяграфія меншавізму. Гэта тлумачыцца тым, што колькасць публікацый аб меншавіках на сучасным этапе значна пераўзыходзіць колькасць даследаванняў аб іншых партыях, што абумоўлівае неабходнасць іх гістарыяграфічнага асэнсавання.

На думку, І. Х. Урылава, гістарыяграфічная сітуацыя 1990-х гг. характарызуецца перавыданнем забароненых раней кніг, шырокім выкарыстаннем замежнай літаратуры, удзелам у сумесных даследчых праектах, што ў выніку прыводзіць да карэкціроўкі старых і выпрацоўкі новых поглядаў і канцэпцый [11].

Гэты падыход разглядаецца ў артыкуле С. В. Цюцюкіна. Ён адзначае, што галоўнымі кірункамі ў вывучэнні гісторыі РСДРП сталі крытыка бальшавізму, з аднаго боку, і рэабілітацыя меншавізму – з другога [12].

Аналізу гістарыяграфіі партыі левых сацыялістаў-рэвалюцыянераў прысвечана дысертацыя і кніга А. У. Сычанковай [13].

Спецыяльныя гістарыяграфічныя даследаванні па гісторыі ПСР прадстаўлены працамі А. А. Кананенкі [14]. Аўтар засяроджвае ўвагу на перыядзе 1901–1922 гг. Ацэньваючы стан распрацаванасці праблемы, ён адзначае, што ў большай ступені гістарыяграфічнаму аналізу падвяргаліся працы, прысвечаныя ўзнікненню ПСР у пачатку XX ст., а таксама іх тэрарыстычнай дзейнасці. У той жа час такія праблемы, як аналіз станаўлення партыі, масавай прапагандысцкай працы, фінансавых аспектаў, выдавецкай дзейнасці, пакуль не сталі аб'ектам увагі даследчыкаў.

*Заключэнне.* Такім чынам, аналіз гістарыяграфічных даследаванняў сведчыць аб паступовым павелічэнні колькасці гістарыяграфічных прац і адпаведна ўзмацненні цікавасці гісторыкаў да абагульнення назапашанага матэрыялу. Разам з тым, можна канстатаваць адсутнасць у сучаснай гістарычнай навуцы гістарыяграфічных даследаванняў, у якіх былі б прааналізаваны ўсе бакі і аспекты развіцця айчыннай гістарыяграфічнай традыцыі ў сферы вывучэння гісторыі сацыялістычных партый. Важным уяўляецца ацаніць тэарэтычна-метадалагічны ўзровень асэнсавання гісторыкамі гісторыі агульнарасійскіх і нацыянальных партый сацыялістычнага кірунку, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст., вызначыць перспектывы дальнейшай навуковай распрацоўкі.

*Літаратура*

1. Общественное движение в России в начале XX века / под ред. Ю. Мартова, П. Маслова и А. Потресова. – СПб. : Тип. т-ва «Общественная польза», 1909–1914. – Т. I–IV.

*References*

1. Obshchesvennoue dvizheniye v Roasoo v nachale XX veka / pod red. Yu. Martova, P. Maslova i A. Potresova. – SPb. : Tip. t-va "Obshchestvennaya polza", 1909–1914. – T. I-IV.

Рэпазіторый БДПУ

2. *Ингулов, С.* О бурно поживший и бесславно погибшей партии: обзор литературы об эсерах / С. Ингулов // Печать и революция. – 1922. – № 8. – С. 93–101.
3. *Спирин, Л. М.* Историография борьбы РКП(б) с мелкобуржуазными партиями в 1917–1920 гг. / Л. М. Спирин // Вопросы истории КПСС. – 1966. – № 4. – С. 101–108.
4. *Гусев, К. В.* Советские историки о крахе партии эсеров / К. В. Гусев // Великий Октябрь в работах советских и зарубежных историков. – М., 1971. – С. 68–109.
5. В. И. Ленин и история классов и политических партий в России. – М., 1970; *Сивохина, Т. А.* Современная историография политического банкротства мелкобуржуазных партий в Советской России / Т. А. Сивохина // История и историки. Историографический ежегодник. 1976. – М., 1979. – С. 71–86; *Гусев, К. В.* Состояние разработки и задачи дальнейшего изучения истории непролетарских партий России / К. В. Гусев // Непролетарские партии России в 1917 году и в годы гражданской войны : материалы науч. симпозиума. – М., 1980. – С. 10–29; *Волобуев, О. В.* Непролетарские партии в России: итоги изучения и нерешенные проблемы / О. В. Волобуев, В. И. Миллер, В. В. Шелохаев // Непролетарские партии России в трех революциях. – М., 1989. – С. 5–20 і інш.
6. *Федоринов, В. Е.* Многопартийность в России (проблемы историографии) / В. Е. Федоринов // Российская цивилизация: история и современность. – Воронеж, 1999. – Вып. 5. – С. 150–165; *Меганов, С. А.* История политических партий России в годы Октябрьской революции и гражданской войны (историография проблемы) / С. А. Меганов // Российская цивилизация: история и современность. – Воронеж, 2001. – Вып. 11. – С. 226–236; *Сергеев, В. Н.* Отечественная многопартийность в 1917–1918 гг. (историографические заметки) / В. Н. Сергеев // Государственное и муниципальное управление. – 2007. – № 3. – С. 41–57; История политических партий России. – М., 1994. – С. 29–38; Теоретико-методологические, историографические и археографические аспекты // Политические партии России: история и современность. – М., 2000. – С. 5–66.
7. *Тютюкин, С. В.* Современная отечественная историография РСДРП / С. В. Тютюкин // Отечественная история. – 1998. – № 6. – С. 54–64. *Ён жа.* Меньшевизм: историографическая панорама / С. В. Тютюкин // Меньшевизм: Страницы истории. – М., 2002. – С. 3–31.
8. *Смирнова, М. И.* Новое в историографии российской социал-демократии / М. И. Смирнова // Мировая социал-демократия: теория, история и современность : материалы конф. – М., 2006. – С. 19–33.
9. *Урилов, И. Х.* От какого наследства следует отказаться / И. Х. Урилов // Меньшевики и меньшевизм : сб. ст. – М., 1998. – С. 9–23; *Ён жа.* История российской социал-демократии (меньшевизма). Ч. 2. Историография. – М., 2001; *Ён жа.* Современная историография Российской социал-демократии // Социал-демократия в российской и мировой истории. Обобщение опыта и новые подходы. – М., 2009. – С. 16–30.
10. *Ненароков, А. П.* «Не все золото, что блестит»: о некоторых аспектах современного изучения послеоктябрьского меньшевизма / А. П. Ненароков // Россия – XXI. – 2009. – № 5. – С. 80–95; *Ён жа.* О некоторых аспектах современного изучения исторического опыта российской социал-демократии // Падение империи, революция и гражданская война в России : сб. сост. С. М. Исхаков. – М., 2010. – С. 91–111; *Ён жа.* Правый меньшевизм: прозрения российской социал-демократии. – М., 2012. – С. 25–89.

2. *Ingulov, S.* O burno pozhivshey i besslavno pogibshey partii: obzor literatury ob eserakh / S. Ingulov // Pechat i revolyutsiya. – 1922. - № 8. – S. 93–101.
3. *Spirin, L. M.* Istoriografiya borby RKP(b) s melkoburzhuaznymi partiyami v 1917–1920 gg. / L. M. Spirin // Voprosy istorii KPSS. – 1966. –- № 4. – S. 101–108.
4. *Gusev, K. V.* Sovetskiye istoriki o krakhe partii eserov / K. V. Gusev // Velikiy Oktyabr v rabotakh sovetskikh i zarubezhnykh istorikov. – M. : 1971. – S. 68–109.
5. V. I. Lenin i istoriya klassov i politicheskikh partiy v Rossii. – M., 1970; *Sivokhina, T. A.* Sovremennaya istoriografiya politicheskogo bankrotstva melkoburzhuaznykh partiy v Sovetskoy Rossii / T. A. Sivokhina // Istoriya i istoriki. Istoriograficheskiy yezhegodnik. 1976. – M., 1979. – S. 71–86; *Gusev, K. V.* Sostoyaniye razrabotki i zadachi dalneyshego izucheniya istorii neproletarskikh partiy Rossii / K. V. Gusev // Neproletarskiye partii Rossii v 1917 godu i v gody grazhdanskoy voyny: Mat. nauch. simpoziuma. – M., 1980. – S. 10–29; *Volobuyev O. V.* Neproletarskiye partii v Rossii: itogi izucheniya i nereshennyye problemy / O. V. Volobuyev, V. I. Miller, V. V. Shelokhayev // Neproletarskiye partii Rossii v trekh revolyutsiyakh. – M., 1989. – S. 5–20, i insh.
6. *Fedorinov, V. Ye.* Mnogopartiynost v Rossii (problemy istoriografii) / V. Ye. Fedorinov // Rossiyskaya tsivilizatsiya: istoriya i sovremennost. – Voronezh, 1999. Vyp. 5. – S. 150–165; *Meganov S. A.* Istoriya politicheskikh partiy Rossii v gody Oktyabrskoy revolyutsii i grazhdanskoy voyny (istoriografiya problemy) / S. A. Meganov // Rossiyskaya tsivilizatsiya: istoriya i sovremennost. – Voronezh, 2001. – Vyp. 11. – S. 226–236; *Sergeyev, V. N.* Otechestvennaya mnogopartiynost v 1917–1918 gg. (istoriograficheskiye zametki) / V. N. Sergeyev // Gosudarstvennoye i munitsipalnoye upravleniye. – Rostov n/D, 2007. – № 3. – S. 41–57; Istoriya politicheskikh partiy Rossii. – M., 1994. – S. 29–38; Teoretiko-metodologicheskiye, istoriograficheskiye i arkheograficheskiye aspekty // Politicheskiye partii Rossii: istoriya i sovremennost. – M., 2000. – S. 5–66.
7. *Tyutyukin, S. V.* Sovremennaya otechestvennaya istoriografiya RSDRP / S. V. Tyutyukin // Otechestvennaya istoriya. – 1998. – № 6. – S. 54–64: *Yon zha.* Menshevizm: istoriograficheskaya panorama / S. V. Tyutyukin // Menshevizm: Stranitsy istorii. – M., 2002. – S. 3–31.
8. *Smirnova, M. I.* Novoye v istoriografii rossiyskoy sotsial-demokratii / M. I. Smirnova // Mirovaya sotsial-demokratiya: teoriya, istoriya i sovremennost : mat. konf. – M., 2006. – S. 19–33.
9. *Urilov, I. Kh.* Ot kakogo nasledstva sleduyet otkazatsya / I. Kh. Urilov // Mensheviki i menshevizm : sb. st. – M., 1998. – S. 9–23; *Yon zha.* Istoriya rossiyskoy sotsial-demokratii (menshevizma). Ch. 2. Istoriografiya. – M., 2001; *Yon zha.* Sovremennaya istoriografiya Rossiyskoy sotsial-demokratii // Sotsial-demokratiya v rossiyskoy i mirovoy istorii. Obobshcheniye opyta i novyye podkhody. – M., 2009. – S. 16–30.
10. *Nenarokov, A. P.* “Ne vse zoloto, chto blestit”: o nekotorykh aspektakh sovremennogo izucheniya posleoktyabrskogo menshevizma / A. P. Nenarokov // Rossiya – XXI. – 2009. – № 5. – S. 80–95; *Yon zha.* O nekotorykh aspektakh sovremennogo izucheniya istoricheskogo opyta rossiyskoy sotsial-demokratii // Padeniye imperii, revolyutsiya i grazhdanskaya voyna v Rossii: sb. sost. S. M. Iskhakov. – M., 2010. – S. 91–111; *Yon zha.* Pravyy menshevizm: prozreniya rossiyskoy sotsial-demokratii. – M., 2012. – S. 25–89.


Рэпазіторый БДПУ

11. *Урилов, И. Х.* История российской социал-демократии (меньшевизма) / И. Х. Урилов. – М., 2001. – Ч. 2. Историография. – С. 316–317.
12. *Тютюкин, С. В.* Современная отечественная историография РСДРП / С. В. Тютюкин // Отечественная история. – 1998. – № 6. – С. 62.
13. *Сыченкова, А. В.* Отечественная историография партии левых социалистовреволюционеров : дис. … канд. ист. наук / А. В. Сыченкова. – Казань, 2003 – 18 с.; *Яна ж.* Отечественная историография партии левых социалистов-революционеров (интернационалистов). – Казань, 2006.
14. *Кононенко, А. А.* Отечественная историография партии социалистовреволюционеров новейшего времени / А. А. Кононенко // Вестник Тюменского государственного университета. – Тюмень, 2002. – № 2. – С. 46–50; *Ён жа.* Современная российская историография партии социалистов-революционеров // Отечественная история. – 2004. – № 4. – С. 112–120; *Ён жа.* Партия социалистов-революционеров в 1901–1922 гг. Проблемы историографии. – Тюмень, 2004.

11. *Urilov, I. Kh.* Istoriya rossiyskoy sotsial¬demokratii (menshevizma) / I. Kh. Urilov. – M., 2001. – Ch. 2. Istoriografiya. – S. 316–317.
12. *Tyutyukin, S. V.* Sovremennaya otechestvennaya istoriografiya RSDRP / S. V. Tyutyukin // Otechestvennaya istoriya. – 1998. – № 6. – S. 62.
13. *Sychenkova, A. V.* Otechestvennaya istoriografiya partii levykh sotsialistovrevolyutsionerov : dis. … kand. ist. nauk / A. V. Sychenkova. – Kazan, 2003 – 18 s.; *Yana zh.* Otechestvennaya istoriografiya partii levykh sotsialistov-revolyutsionerov (internatsionalistov). – Kazan, 2006.
14. *Kononenko, A. A.* Otechestvennaya istoriografiya partii sotsialistovrevolyutsionerov noveyshego vremeni / A. A. Kononenko // Vestnik Tyumenskogo gosudarstvennogo universiteta. – Tyumen, 2002. – № 2. – S. 46–50; *Yon zha.* Sovremennaya rossiyskaya istoriografiya partii sotsialistov-revolyutsionerov // Otechestvennaya istoriya. – 2004. – № 4. – S. 112–120; *Yon zha.* Partiya sotsialistov-revolyutsionerov v 1901–1922 gg. Problemy istoriografii. – Tyumen, 2004.

Рэпазіторый БДПУ